


**«Варган» на III Усерасійскім фестывалі народна-пеўчага мастацтва «Вечные истоки», арганізаваным Расійскай акадэміяй музыкі імя Гнесіных, Масква, 2013 г.**



**Спецыяльнасць:** «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)».

**Кваліфікацыя:** «Гісторык. Выкладчык гісторыі і сацыяльна-гуманітарных дысцыплін».

**Формы навучання:** дзённая (4 гады); завочная (дыстанцыйная) (5 гадоў).

## Каб стаць студэнтам-гісторыкам ПДУ, неабходна:

1. *здаць ЦТ па прадметах:*
- *гісторыя Беларусі;*
- *гісторыя навейшага часу;*
- *беларуская (руская) мова;*
2. *падаць у прыёмную камісію:*
- *заяву на імя рэктара;*
- *арыгіналы сертыфікатаў ЦТ;*
- *арыгінал дакумента аб адукацыі і дадаткаў да яго;*
- *медыцынскую даведку;*
- *6 фотаздымкаў 3х4 см;*
- *+ дакументы, што пацвярджаюць пра-ва на ільготы (пры наяўнасці).*

*Падрабязная інфармацыя — на сайце Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта* ***psu.by****.*

*Абітурыенту-2015*

*Студэнты-гісторыкі Полацкага ўніверсітэта не толькі вучацца.*

# Фальклорны гурт «Варган»



# Вучыцца «на гісторыка» трэба ў Полацку!

Фальклорны гурт «Варган» дзейнічае на базе гістарычна-філалагічнага факультэта Полацкага ўніверсітэта. Ён быў створаны ў 2011 г.

Аснову рэпертуара гурта складаюць традыцыйныя беларускія песні розных жанраў: калядныя...



Каляды-2011. Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я



Гуканне вясны-2013, Полацк

... веснавыя, купальскія, вясельныя, лірычныя, жартоўныя. Песні спяваюцца акапэльна, без інструментальнага супра-ваджэння.



Купалле-2012

**Вольга Антонаўна Емяльянчык – кіраўнік гурта «Варган»** – са студэнцкіх часоў займаецца вывучэннем аўтэнтычнай спеўнай традыцыі беларусаў.



Гурт «Варган» і яго кіраўнік кандыдат біялагічных навук, дацэнт кафедры В.А. Емяльянчык (справа)

Гурт выконвае песні з розных рэгіёнаў Беларусі – Палесся, Цэнтральнай Беларусі, Падняпроўʼя і Пасожжа, Панямоння. Асаблівае месца ў рэпертуары займаюць песні Беларускага Падзвіння, запісаны ўдзельнікамі гурта падчас этнаграфічных экспедыцый.